№№69–70 (3608–3609)

4 мая 2012 г.

Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах

Выдавец: УП «Народная Воля». Кошт — свабодны.

Да ўвагі!

Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

ПАД ГРАДУСАМ

На выхадныя — дажджы

У Мінску сёння, 4 мая, без істотных ападкаў. Вецер паўднёва-ўсходні 4—9 м/с. Тэмпература паветра мінімальная ноччу 7—9°С, максімальная днём 22—24°С.

У наступныя двое сутак па краіне будзе воблачна з праясненнямі. **У суботу, 5 мая**, на большай частцы тэрыторыі кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Вецер паўднёва-ўсходні з пераходам на заходні 4—9 м/с, пры навальніцах парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра мінімальная ноччу плюс 10—17°С, максімальная днём 18—25°С.

У нядзелю, 6 мая, ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Вецер пераменных напрамкаў 5—10 м/с, днём па захадзе месцамі парывы да 15—18 м/с. Тэмпература паветра мінімальная ноччу плюс 7—12°С, максімальная днём 18—24°С; па паўднёвым усходзе ноччу 13—16°С, днём 25—28°С.

БЛИЦ



Владимир ПАРФЕНОВИЧ, экс-депутат Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь:

— До тех пор, пока в Беларуси будут непрозрачные выборы, пока сохранится досрочное голосование, пока комиссии будут формироваться так, как они формируются сейчас, наш Фидель Кастро будет с нами всегда.

Эти слова известного олимпийского чемпиона и экс-депутата Палаты представителей Национального собрания Владимира Парфеновича прозвучали пару лет назад в интервью "Белорусской газете". Насколько они актуальны сейчас, в преддверии очередной политической кампании по выборам в Палату представителей? Своим собеседникам "Народная Воля" поставила вопрос так:

Согласны ли вы с Владимиром Парфеновичем? Если да, то как изменить ситуацию?

Леонид ЛЫЧ, доктор исторических наук, профессор:

— Я полностью согласен с Парфеновичем. А как изменить ситуацию? Сами белорусские власти на это никогда не пойдут. И никогда не пойдут на то, чтобы люди могли реально влиять на политическую жизнь страны. Белорусы тоже ничего не смогут сделать, потому что у нас нет оппозиционных сил, которые были бы в состоянии повести за собой массы. Оппозиция не имеет должного профессионализма в своей работе. Она сегодня больше занимается своими внутренними делами, работает сама на себя. Выйти же к народу не умеет или не хочет. Скорее всего — не умеет. Картина, безусловно, пессимистическая, но давайте смотреть правде глаза.

Лявон ВОЛЬСКИЙ, рок-музыкант:

— Я сам был наблюдателем на последних выборах и могу сказать, что выборы напоминают смешной фарс. Председатель комиссии может делать все что угодно, и все ему подыгрывают. Одним словом, спаянный коллектив. Впрочем, сражаться за какие-то изменения в избирательном процессе — тоже смешно. Это то же самое, что говорить: "Что нужно сделать, чтобы в Беларуси появился нормальный человеческий шоу-бизнес?" Нужно менять всю систему сверху донизу. Но кто будет менять Избирательный кодекс? Это же не реально. Или поменяют так, что снова все останется на своих местах.

Вадим ДЕВЯТОВСКИЙ, серебряный призер Олимпийских игр по метанию молота:

— Я возглавляю новополоцкое отделение организации "Белая Русь" и на себе проверил, что государство проводит выборы честно. Оппоненты утверждают, что белорусские выборы не соответствуют каким-то стандартам, но активность они почему-то проявляют только тогда, когда начинается избирательная кампания. До этого их не видно и не слышно. Может быть, они не сильно и стремятся побеждать? А сняться перед выборами и затем дискредитировать их — на это много ума не надо. Для меня это несколько удивительно. Но народ-то не обманешь. Если бы выборы на самом деле были фальсифицированы, то люди массово вышли бы на улицу. Да, есть в стране временные трудности, но все мы честно работаем... И давайте честно говорить о том, что хорошего сделано в государстве, а не хаять и страну, и выборы.

Геннадий БУРАВКИН, поэт, лауреат Государственной премии Беларуси:

— С Парфеновичем я абсолютно согласен, но если бы знал, как изменить эту ситуацию, то, думаю, радовался бы не только я. Думаю, что и сам олимпийский чемпион этого не знает. Но не сомневаюсь, что изменить что-то может только народ. Надежд на оппозицию нет — она загнана в подполье и малочисленна. Однако если люди не захотят мириться с тем, что происходит, тогда и власть может пойти на уступки. Сама она уступок просто так делать не будет.

Виктор ЧАЙКОВСКИЙ, предприниматель:

— Поддерживаю спортсмена. А чтобы выборы были прозрачными, надо внести изменения в избирательное законодательство. Думаю, это реально, этого надо добиваться. Как говорят, вода камень точит. Да и власть должна понимать, что невозможно реформировать экономику, чего, кстати, требует и Россия, без проведения политических реформ.

Мария ГЕРАСИМОВИЧ, пенсионерка:

— Я свою жизнь уже прожила, поэтому политикой особо не интересуюсь. А как лучше проводить выборы, это, наверное, должно больше политиков беспокоить. Мне бы сейчас со своим здоровьем разобраться...

З НАГОДЫ



Бел-чырвона-белыя стужкі да гадавіны рэферэндуму-1995

Прыхільнікі Руху "За Свабоду" вырабілі бел-чырвона-белыя стужкі да гадавіны рэферэндуму, што прайшоў у Беларусі ў 1995 годзе і паводле якога ўлады змянілі нацыянальную сімволіку.

Такой стужкай майскімі днямі (і не толькі) можна прадэманстраваць пашану да нацыянальных сімвалаў, прычапіўшы яе на антэну аўтамабіля, вопратку ці, скажам, заплечнік. Будзе прыгожа глядзецца бел-чырвона-белая стужка і павязанай на лбе як аздоба да прычоскі. Ці на дрэве каля пад'езда.

Рэферэндум-1995 стаў першым у гісторыі незалежнай Беларусі. Ён прайшоў 14 мая з ініцыятывы прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Герб "Пагоня" і бел-чырвона-белы сцяг былі заменены пасля яго на крыху мадыфікаваную сімволіку БССР (герб з каласкамі і чырвона-зялёны сцяг). Апрача таго, рускай мове быў нададзены статус дзяржаўнай. Можна сказаць, з рэферэндуму пачалася чарговая хваля русіфікацыі.

ТЭНДЭНЦЫІ

Любоў да радзімы на апошніх месцах у іерархіі каштоўнасцяў беларускай моладзі

Пра гэта сведчаць вынікі сацыялагічнага апытання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Як паведаміла вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАНБ **Вольга Паўлоўская,** сярод асноўных каштоўнасцяў беларусаў — ***сям'я, здароўе, каханне, дзеці, сябры.*** Затым ідуць матэрыяльныя каштоўнасці.

На думку вучонага, гэта сведчыць аб сыходзе ад абстрактных уяўленняў аб патрыятызме, якія былі ўласцівыя савецкім людзям. Зараз моладзь сканцэнтравана перш за ўсё на сабе і сваіх дасягненнях. Тым не менш нізкая каштоўнасць патрыятызму для беларускай моладзі выклікае занепакоенасць у спецыялістаў, адзначыла Паўлоўская. Паводле яе слоў, у фарміраванні грамадзянскай пазіцыі людзей адыгрывае ролю не толькі непасрэднае ўздзеянне: уплыў школы, сям'і, выхавальнікаў і настаўнікаў, — але і тое, наколькі грамадства і дзяржава даюць магчымасці для рэалізацыі кожнага чалавека, паведамляе БелаПАН.

Паўлоўская лічыць, што ***ў далейшым у беларускім грамадстве каштоўнасць патрыятызму можа яшчэ больш знізіцца***. З наступнага года ў ВНУ краіны адбудзецца значнае скарачэнне гадзін па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах, што можа прывесці да недахопу выхаваўчай працы з моладдзю.

У сваю чаргу прэс-сакратар кампаніі "Будзьма беларусамі!" **Алесь Плотка** падкрэсліў, што патрыятызм — гэта любоў не толькі да радзімы, але і да свайго народа. Паводле апытанняў, сёння амаль кожны беларус не атаясамлівае сябе з народам. На думку Плоткі, для павышэння каштоўнасці патрыятызму ў беларускай моладзі варта ўжываць новыя інфармацыйныя тэхналогіі, выкарыстоўваць сучасныя з'явы ў маладзёжнай культуры. Адзін з варыянтаў выхавання патрыятызму — стварэнне адпаведных камп'ютарных гульняў.

Застаецца толькі памяць...

У Гімалаях зніклым год таму беларускім альпіністам установяць мемарыял памяці.

Нагадаем, што сувязь з двума беларускімі альпіністамі — Мікалаем Бандалетам і Сяргеем Белавусам — знікла 8 мая мінулага года. Яны ўзніmaліся на адну з самых цяжкадаступных вяршыняў свету — Тулагі (вышынёй 7029 метраў) у Непале. Дагэтуль пакарыць яе не ўдавалася ніводнаму чалавеку.

З 13 мая зніклых шукалі на верталёце, праз некалькі дзён знайшлі палатку з рэчамі альпіністаў і ланцужок іх слядоў, якія ішлі на грэбень. Пасля пошукі спынілі. Спачатку з-за дрэннага надвор'я, пасля — з-за адсутнасці грошай.

Жонка Мікалая Бандалета Таццяна распавядала "Народнай Волі", што збіралася нават прадаць кватэру, каб заплаціць за пошукавыя работы. Новых спонсараў не знаходзілася.

Зараз каманда беларускіх альпіністаў адправілася ў Гімалаі, дзе ў базавым лагеры Тулагі будзе ўсталяваны мемарыял памяці зніклых калег.

Алесь СІВЫ.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Каб помнілі...

У Мінску да гадавіны гучных судовых працэсаў над удзельнікамі падзей 19 снежня 2010 года былі прэзентаваны адразу два выданні: фотаальбом "За права на выбар: Партрэты асуджаных. Плошча-2010" і "Наша Вясна. Гісторыя ў асобах".

У фотаальбоме "За права на выбар: Партрэты асуджаных. Плошча-2010"прадстаўлены фігуранты крымінальнай справы, якая была пасля падзей апошняй прэзідэнцкай кампаніі. Выданне "Наша Вясна. Гісторыя ў асобах" прысвечана 16-гадовай гісторыі праваабарончага цэнтра "Вясна", які быў зачынены ўладамі.

На прэзентацыі было досыць шмат прысутных. Людзі выступалі, успаміналі, глядзелі з надзеяй у будучыню...



Алена ЛАПЦЁНАК, рэдактар фотаальбома "За права на выбар: Партрэты асуджаных":

— Ідэя стварэння фотаальбома з'явілася, калі ўжо было вядома, што па справе 19 снежня праходзяць каля 50 чалавек. Было жаданне паказаць людзей у той складаны момант. Прадмову да выдання збіраўся пісаць наш калега Алесь Бяляцкі, але зараз ён і сам, як вядома, знаходзіцца за кратамі...

Аляксей КАРОЛЬ, журналіст і палітолаг:

— Гэтымі выданнямі праваабаронцы зрабілі вялікі ўнёсак у дакументальную базу для будучых даследаванняў дэмакратычнага руху Беларусі найноўшага часу. Плошча-2010 — знакавая падзея для гісторыі. Між тым не толькі сумная падзея, але і аптымістычная. На плошчу выйшлі дзясяткі тысяч людзей. Хапіла маленькай паўзы, лібералізацыі, каб страх знік. Гэта знак таго, што страх рассейваецца хутка. Улада добра разумее, што яшчэ крыху — і ўжо нічога не стрымае народ, вырве кантроль над сітуацыяй з іх рук. Плошча — не выпадковасць, а з'ява ў вызваленчым руху Беларусі. Пункт погляду ўлады на тыя падзеі як на беспарадкі не мае падтрымкі ў грамадстве.

Валянцін СТЭФАНОВІЧ, праваабаронца:

— Некаторыя з тых, хто быў асуджаны за падзеі 19 снежня, да гэтага часу застаюцца ў турмах. Гэта і былы кандыдат у прэзідэнты на апошніх выбарах Мікола Статкевіч, і Павел Севярынец, і маладзёжныя актывісты Зміцер Дашкевіч ды Эдуард Лобаў, справы якіх мы таксама непасрэдна звязваем з 19 снежня, бо хлопцы былі затрыманы прэвентыўна і па абсалютна сфальсіфікаванай крымінальнай справе апынуліся за кратамі. Мы па-ранейшаму патрабуем неадкладнага і безумоўнага вызвалення ўсіх палітвязняў без аніякіх прашэнняў аб памілаванні. На мой погляд, гэта вызваленне больш залежыць ад знешнепалітычных фактараў. Грамадства знаходзіцца ў атмасферы страху — гэта бачна нават па апошніх акцыях... Выданні ж, якія мы прэзентуем, будуць прадстаўлены ў пяці еўрапейскіх краінах. Праваабаронцы робяць усё магчымае, каб пытанне вызвалення людзей заставалася актуальным для Еўрасаюза і ўвага да гэтага не знікала.

Таццяна РАВЯКА, праваабаронца:

— Кніга "Наша Вясна. Гісторыя ў асобах" прымеркавана да гадавіны з дня заснавання праваабарончага цэнтра "Вясна". Гэта інтэрв'ю, партрэты нашых сяброў-праваабаронцаў... Ідэя стварэння кнігі належыць Алесю Бяляцкаму. Ён як сапраўдны гісторык і літаратар казаў: *"Таго, што не пакладзена на паперу, можна лічыць, што і не было".* Алесь хацеў, каб выданне стала адказам на шалёную дыскрэдытацыю беларускіх праваабаронцаў з боку ўлад. Спадзяюся, што такі адказ атрымаўся...

Марына АДАМОВІЧ, жонка палітзняволенага, экс-кандыдата ў прэзідэнты Мікалая Статкевіча:

— Прайшло 16 з паловай месяцаў пасля 19 снежня 2010 года. Гэта, безумоўна, страшэнны тэрмін для тых, хто застаецца за кратамі. Дата пастаянна з намі, яна ў нашых сэрцах, уплывае на ўсё цяперашняе жыццё. Але, лічу, пакуты палітзняволеных не былі дарэмнымі. Веру, што падзеі, нягледзячы на іх жахлівы брутальны характар, набліжаюць канец рэжыму, які зараз пануе. Людзі тады пераадолелі свой страх, яны зразумелі, што аднадумцаў шмат. Пасля таго як многія апынуліся за кратамі, народ стаяў у чэргах, каб неяк дапамагчы зняволеным... Гэтага ў беларусаў ужо ніхто і ніколі не адніме. Гэта напісаная гісторыя. Увесь свет убачыў сапраўдны твар улады. І салідарнасць Еўропы гэта пацвярджае... Сёння за кратамі знаходзяцца толькі чатыры чалавекі па справе 19 снежня, але там жа — і Алесь Бяляцкі, і Мікола Аўтуховіч, і Сяргей Каваленка. Яны працягваюць сваю барацьбу. Гэта супрацьстаянне сіл дабра і святла з сіламі зла і цемры. Я хачу падзякаваць усім, хто ім дапамагае ў гэтай барацьбе. Спадзяюся, што ўсе разам мы гэтую вайну выйграем.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

P.S. Выдаўцы альбома "За права на выбар" прыносяць шчырыя прабачэнні і выпраўляюць прыкрую памылку, якая закралася ў выданне: у біяграфіях Наталлі Радзінай і Ірыны Халіп пазначана, што яны выйшлі з "амерыканкі" 29 снежня, у той час як гэта адбылося толькі праз месяц — 29 студзеня. Гэтай недакладнасці няма ў хроніцы падзей, змешчанай на пачатку фота-

АКТУАЛЬНА

Колькі будзе каштаваць хлеб пры заробку ў 500 долараў?

*А.Лукашэнка ўчора яшчэ раз нагадаў пра тое, што да канца года заробкі павінны дасягнуць 500 долараў... "Нам усё ж такі на ўзровень 500 долараў да канца года трэба выходзіць, як мы і дамаўляліся", — заявіў А.Лукашэнка, прымаючы з дакладам старшыню Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі **Леаніда Козіка**.*

Рысу сярэдняга заробку ў 500 долараў беларусы перасягнулі толькі аднойчы — у 2010 годзе. А пасля дэвальвацыі, якая здарылася ў 2011 годзе, заветная пяцёрачка з двума нулікамі ніяк не давалася ў рукі. Пасля крызісу некранутай засталася высокая стаўка толькі для праграмістаў, нафтавікоў, шахцёраў, супрацоўнікаў хімічнай вытворчасці і супрацоўнікаў фінансавай сферы.

Для іншых заробак даўноператварыўся ў сродак выжывання. Згодна з данымі, якія днямі растыражыравала РІА "Новости", беларусы выдаткоўваюць на харчаванне больш за 40% заробку. Па даных Белстата, сярэдні заробак беларусаў за сакавік склаў 3 мільёны 159 тысяч 624 рублі. Практычна палова ад гэтай зусім несур'ёзнай сумы — 1 мільён 263 тысячы 850 рублёў — штомесяц сыходзіць на ежу! Астатнія грошыкі трэба размеркаваць на аплату кватэры, камуналкі, рэчы першай неабходнасці і праезд да працы... Нагадаю, сярэдні заробак — амаль 400 долараў, і іх катастрафічна не хапае. Бо кошты растуць шалёна. Каб купіць больш-менш прыстойныя прадукты, трэба аддаць паўзарплаты. І гэта не перабольшванне, а рэальнасць.

Дык што ж такога прывабнага ў сярэднім заробку ў 500 долараў? Прыбаўка трохі больш, чым у сотню долараў, не выратуе становішча. Кошты растуць куды хутчэй, чым уяўленне прэзідэнта аб добрым заробку...

Марыя МАЛЕВІЧ.



ПРАБЛЕМА!

Мазгі на экспарт



Беларусі пакуль не ўдалося спыніць "уцечку мазгоў". Пра гэта заявіў галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей Кілін.

"Заробкі, якія атрымліваюць маладыя супрацоўнікі, — гэта не зусім правільна, і мы гэта разумеем", — падкрэсліў ён.

Разам з тым Кілін адзначыў, што маладыя вучоныя "*маюць магчымасць атрымліваць такія ж грошы, што і людзі, якія даўно прапрацавалі ў навуцы". "Прыйшоў малады — адразу атрымаў два мільёны рублёў, а далей ён прапрацаваў тры гады, у яго з'явілася сям'я, і яму трэба зарабляць вялікія грошы. І мы прапануем: займайся пытаннямі, звязанымі з экспартна арыентаванымі прадуктамі, працуй на рынак, і ў цябе будзе заробак дастатковы* ", — цытуе **БелаПАН** галоўнага вучонага сакратара НАНБ.

На яго думку, супрацоўнікі, якія даўно працуюць у навуцы, *"таксама павінны пераарыентавацца на гэта".*

Кілін падкрэсліў, што сярэдні ўзрост навукоўцаў — 49,1 года, хоць *"сярэдні ўзрост акадэмікаў — зашкальвае, але акадэмія — маладая: 29% супрацоўнікаў маюць узрост да 33 гадоў".*

"*У мерапрыемствах па рэфармаванні навукі ставіцца задача па павелічэнні магчымасці зарабляць вялікія грошы навуковым супрацоўнікам, карыстаючыся сучаснымі метадамі аплаты працы",* — запэўніў галоўны вучоны сакратар НАНБ.

Як адзначыў прарэктар па навуковай рабоце БДУ Алег Івашкевіч, зняты ўсе абмежаванні на аплату працы па гаспадарчых дагаворах. *"Заключайце гаспадарчыя дагаворы, афармляйце часовыя навуковыя калектывы і плаціце людзям"*, — сказаў ён.

ПРАГНОЗЫ НА БУДУЧАЕ

«Праз 3—4 гады такога існавання мы цалкам страцім кваліфікаваную працоўную сілу»

Некаторыя эксперты даюць зусім не суцяшальныя прагнозы на бліжэйшую будучыню, нягледзячы на тое, што лічбы, на якія спасылаюцца чыноўнікі ў сваіх справаздачах, быццам бы даволі аптымістычныя.

Афіцыйна

Калі верыць статыстыцы, то ў першым квартале прамысловасць краіны спрацавала з рэнтабельнасцю продажаў 10,4%, сельская гаспадарка — 15,3%. "Такім чынам, палітыка закупачных цэн, маркетынгавая палітыка сведчаць пра тое, што эканамічны стан гаспадарчых суб'ектаў значна палепшыўся, — гаворыцца ў адным з нядаўніх паведамленняў прэзідэнцкай прэс-службы. — *Што тычыцца эканомікі краіны ў цэлым, то, па статыстыцы, за студзень-люты бягучага года склалася станоўчае сальда ў памеры 838 мільёнаў долараў. Гэтыя даныя ўключаюць не толькі гандлёвы абарот. Расце прыток валюты ў краіну — ён зараз перавышае яе адток крыху больш, чым на 900 мільёнаў долараў.*

Такім чынам, паляпшэнне эканамічнага становішча адзначаецца на ўсіх узроўнях: і на прадпрыемствах, і ў рэгіёнах, і ў цэлым па краіне. Павялічваецца і тавараабарот: у студзені бягучага года ён складаў 103,5% да досыць высокага ўзроўню першага квартала 2011 года, калі адзначаўся павышаны попыт на прадукцыю; у сакавіку павялічыўся яшчэ на 10,5%".

Эканаміст **Сяргей Чалы** лічыць, што калі сітуацыю ў краіне пакінуць без змен і рэформ, то *"праз 3—4 гады такога існавання мы цалкам страцім кваліфікаваную працоўную сілу".*

— Зараз самае галоўнае пытанне ў тым, што пацыента, умоўна кажучы, вылечылі ад інсульту, а ўсе хранічныя хваробы ў яго засталіся, — *дзеліцца сваімі разважаннямі эканаміст.* — І далейшай стратэгіі няма. Ніхто не разумее, як развівацца далей, як павышаць даходы. Дакладней, зразумела, што штучным чынам гэта зрабіць немагчыма, бо здарыцца новы крызіс. Значыць, трэба ствараць рынкавае асяроддзе, займацца прыватызацыяй і лібералізацыяй цэн і г.д. Гэта павінна быць зусім іншая эканамічная мадэль, у якой многія беларускія чыноўнікі сябе не бачаць.

А ніякай альтэрнатыўнай мадэлі няма. І пры ўсім тым, што ў нашых прадпрыемстваў і фінансавае становішча палепшылася, і ўсё быццам бы ў парадку, яны ўпершыню апынуліся ў сітуацыі, калі вымушаны жыць па сродках, ва ўмовах бюджэтных абмежаванняў, калі трэба вяртаць крэдыты. І атрымліваецца, што пасля таго, як адбылася стабілізацыя на макраўзроўні, патрэбны змены на мікраўзроўні.

Мы не пойдзем на вяртанне да старой мадэлі: яна цалкам дыскрэдытавана, але чыноўнікі не выберуць і рынкавую мадэль развіцця, таму што для іх гэта страшна і непрымальна. Значыць, будзем выбіраць нешта сярэдняе.

Але калі ёсць выбар паміж дзвюма альтэрнатывамі, то выбар нечага сярэдняга — гэта самае горшае. Таму мы будзем і надалей знаходзіцца ў такім "балотным" стане. А калі цяпер пакінуць усё, як ёсць, то праз тры-чатыры гады такога існавання мы цалкам страцім кваліфікаваную працоўную сілу. І тады ў гэтай краіны наогул не будзе будучыні. Гэта, дарэчы, класічная, шматкроць апісаная ў эканамічнай літаратуры пастка беднасці, якая характэрна для афрыканскіх краін. Там нават знешняя дапамога не дапамагае, бо няма каму ствараць рост эканомікі, няма работнікаў таго ўзроўню, якія маглі б займацца прадукцыйнай працай. Яны жывуць за кошт ААНаўскай дапамогі. Такой будзе і наша будучыня, калі мы спынімся ў сваім развіцці.

Вера ВІР.

ЗА КРАТАМІ

Сяргея Каваленку этапіравалі з Навінак на «Валадарку»

Днямі Сяргея Каваленку этапіравалі з Рэспубліканскага псіхіятрычнага шпіталя ў Навінках у мінскі следчы ізалятар на вуліцы Валадарскага.

Пра гэта паведаміла ягоная жонка Алена з спасылкай на ўрача шпіталя.

Пра вынікі псіхіятрычнай экспертызы, якую Сяргей Каваленка праходзіў у Навінках, урач не паведаміў, але жанчына мяркуе, што яны будуць адмоўныя і яе мужа неўзабаве могуць накіраваць для адбыцця пакарання ў адну з калоній.

"Спачатку, натуральна, яны мусяць скончыць разгляд ягонай касацыйнай скаргі ў Віцебскім абласным судзе, але не сумняваюся, што пасля гэтага Сяргея адправяць у калонію", — сказала Алена Каваленка ў эфіры Радыё Свабода.

Яна таксама паведаміла, што Сяргей паабяцаў распачаць новую галадоўку, калі яго не выззваляць, а этапіруюць у калонію.

ПОЛИТИКА

Анатолий Лебедько написал прошение президенту

Правда, не белорусскому, а украинскому.

— Вчера во время конференции Демократического парламентского форума, которая состоялась в Вильнюсе, подписал прошение на имя президента Украины, — *рассказывает политик.* — Вместе с известным сенатором **МакКейном**, сопредседателем движения "Солидарность" **Борисом Немцовым**, **Зингерисом** и многими другими. Просим **Виктора Януковича** освободить **Юлию Тимошенко** и дать ей возможность выехать на лечение из Украины. Это тот случай, когда можно просить...

Даша ПАВЛОВСКАЯ.

ЭКАНОМІКА

Беларусь не збіраецца прадаваць "Белавія"

Наадварот, плануецца папаўненне парка "Белавія" новымі самалётамі і пашырэнне маршрутнай сеткі палётаў.

Пра гэта паведаміў міністр транспарту і камунікацый ***Іван Шчэрба****.*

"У Мінтрансе гэтае пытанне не абмяркоўваецца і не будзе абмяркоўвацца ні ў гэтым, ні ў наступным годзе, — падкрэсліў Іван Шчэрба, каментуючы інфармацыю ў СМІ аб магчымасці продажу "Белавія" расійскай авіякампаніі "Аэрофлот". — *Мы толькі разглядаем пытанні аб узбуйненні кампаніі і развіцці яе магутнасцяў".*

Ён распавёў, што ў гэтым годзе парк "Белавія" папоўніцца двума самалётамі. Плануецца адшукаць магчымасці для набыцця яшчэ не менш як двух паветраных суднаў: *"На якіх умовах гэта пройдзе — фінансавы, аператыўны лізінг або прамая купля — гэта іншае пытанне. Галоўнае, што мы ставім задачу набыцця новых самалётаў".*

С МОЕЙ КОЛОКОЛЬНИ



Елена МОЛОЧКО

С любовью. Но без деспотизма

Поговорим о странностях любви. Между читателем и писателем — в данном случае журналистом. С одной стороны, ваши письма и звонки, уважаемые читатели, — наши творческие источники. Без живой подпитки с мест, без обратной связи мы бы скукожились, как прошлогодние улитки, от которых к весне остаются лишь пустые коробочки. С другой стороны, ваше внимание часто граничит с диктатом. Да-да, именно так. За свою любовь к газете вы требуете порой полного подчинения своему мнению. Впрочем, и в обществе в целом сегодня нет толерантности. Конечно, трудно... Но хуже другое: нет нормальной дискуссии. Нет даже ее желания. Нет согласия на разногласие!

Чужая позиция бесит. Чужое мнение прямо-таки оскорбляет. А ведь мы когда-то мечтали именно о свободе позиций. Но слово "плюрализм" — вы заметили? — давно исчезло из нашей лексики. Зато, мне кажется, опять в ходу настоящий большевизм и его лозунги. "Кто не с нами, тот против нас!" "Оппонент — значит, враг", — представители обоих лагерей обосновались на баррикадах и ведут друг по другу прицельный огонь.

Вот такой сложный период общественного развития.

Но журналисты — если они журналисты, а не политики — должны быть в стороне от линии фронта. Такая уж профессия — быть наблюдателями, а не участниками борьбы. Собирать информацию. Действовать исключительно в рамках закона. Но, к сожалению, читатели подчас требуют от нас "стать к орудию" и "палить". "Или вы не "Народная Воля"!" Как говорится, от любви до ненависти...

Вот буквально минуту назад раздался телефонный звонок, и я отвлеклась от этих заметок, чтобы поговорить с Валерием Захаровичем — читателем "Народной Воли" из Минска. У человека тяжелейший период в жизни, он недавно похоронил жену. Когда она болела, приходилось сильно тратиться на лекарства. И на подгузники — огромная статья расхода. А оба — пенсионеры, инвалиды, то есть доходы очень скромные, если не сказать, минимальные. Валерий Захарович обратился в органы социального обеспечения за помощью — небольшая, но все-таки материальная поддержка его жене, лежачей больной, именно на подгузники была положена. Но пока супруг собирал документы, его жена умерла... Кто виноват? Да, волокита органов, да, собственная нерасторопность... Но Валерий Захарович настаивает: раз деньги положены, то отдайте! Чиновники отвечают: "Ведь вы не успели вовремя подать документы, ваша супруга уже умерла. Кому мы будем выплачивать пособие?"

Валерий Захарович считает, что это несправедливо. И закон, на который ссылаются чиновники, по его мнению, антинародный, его надо менять. Что вполне возможно, но...

Читатель говорит, что он обратился в "Советскую Белоруссию" — журналисты не смогли ему помочь. Теперь вот он звонит в "Народную Волю". Но я, выслушав, тоже развела руками. Материальное пособие на подгузники умершему не дают. Закон. Как его обойдешь? И тогда Валерий Захарович, разгневавшись, бросает: "Ну, вы прямо как в "СБ"!" И столько обиды, столько, я бы даже сказала, скрытой угрозы в голосе... Разговор вот-вот мог закончиться конфликтом. К счастью, избежали. Но реплика была симптоматичной!

Или вот ситуация. Недавно в газете были напечатаны мои заметки о поездке Купаловского театра в Лондон — "Агитация эпохи Уршули Радзивилл" ("НВ", 20 марта). Я посчитала, что событие не рядовое, сожалея, что мы, журналисты, не сделали вовремя хорошую рекламу маленьким английским гастролям купаловцев. А информационный вакуум неожиданно дал повод конкурентам (вернее конкуренту, одному весьма заинтересованному человеку) считать поездку Национального театра чуть ли не тайным агитационным мероприятием. О, если бы государства обменивались "бомбами" такого содержания, такого таланта!.. Конечно, поездку готовили заранее, Посольство РБ в Великобритании действительно приложило немало сил, чтобы она состоялась. Почему это надо высмеивать? Для того оно и Посольство Республики Беларусь. Вот недавно в Москве выступал Чикагский симфонический оркестр - и, кстати, именно по приглашению американского посольства в России. Есть, значит, такая практика. А лично я вообще очень рада, что пьесу Уршули Радзивилл увидят за границей. Это веселая арлекиниада, которая забавляла некогда наших князей, воссоздана талантливым Николаем Пинигиным — и с блеском. Без тяжелого психологизма и ложной многозначительности — виртуозная театральная игра в чистом виде.

И тем не менее на гастроли выпал "кислотный дождь" другого режиссера — Николая Халезина. Вроде бы коллега, а столько желчи в его письме о купаловцах... Свободный театр, которым руководит господин Халезин и который с некоторых пор обретается в Лондоне, в это время тоже будет выступать на тех же лондонских подмостках — в театре Блумсбери. Но Халезина пригласили сами англичане, ведь за его коллективом идет слава борцов с политическим режимом Лукашенко, а это открывает и не такие двери, как шекспировский фестиваль. Будем откровенны до конца: не только и не столько творческие достижения берутся теперь на Западе во внимание в первую очередь, когда кого-то приглашают на гастроли.

Кстати, в заметке в основном были даны комментарии к поездке купаловцев в Лондон Дианы Дорожок, руководителя зарубежного отдела Национального театра — и весьма корректные. Я как представитель газеты почти не давала оценок, лишь обрисовав ситуацию в целом. Но какова же была реакция некоторых читателей, приславших на наш сайт свои отклики! Вы поддерживаете Купаловский? Это позиция для "СБ"! Куда смотрит редактор?! Или, может, у вас сменился редактор???

Приехали. Ну разве это не по-большевистски: злое ерничание, яростное, отчаянное желание единомыслия, единообразия? А ведь газета предоставила читателям всего лишь информацию. Информацию, которая не по душе оппонентам власти. И за это нам сразу присвоили ярлык, желая унизить автора и главного редактора. Отхлестали, да пожестче! Вот ведь как получается: призываем к свободе слова, но при первых намеках на плюрализм сразу готовы растянуть колючую проволоку границ для чужого мнения.

Хочу уточнить, "Народная Воля" — не подпольный печатный листок, априори нападающий на все и вся по поводу и без. И принцип свободной критики, которой придерживается наша газета, — это не терроризм, не бомбометание. Мы ни с кем не воюем. Мы созидаем. Отмечая и поддерживая все здоровое, прогрессивное. Уважая мудрое, традиционное. Печатая различные точки зрения, предлагая газетную трибуну заведомым оппонентам. Стараясь называть вещи своими именами, воров — ворами, а людей, преступивших закон, — преступниками. В общем, занимаемся журналистикой. И, конечно, надеемся на сотрудничество с читателями и в дальнейшем. С любовью. Но без деспотизма.

ДУПЛЕТ

Николай ЛАДУТЬКО,
председатель Мингорисполкома:

Цена квадратного метра жилья в столице должна достигать 2 тысяч долларов в эквиваленте

Такую цифру чиновник озвучил на заседании общественно-консультативного совета по развитию предпринимательства.

— Когда у города были возможности, он вкладывал огромные средства в инженерно-транспортную инфраструктуру жилищного комплекса. Граждане строили вторые и третьи квартиры по стоимости без учета этих затрат, — процитировало Николая Ладутько агентство "Минск-Новости".

Однако сегодня определенный класс собственников в жилищном секторе сформирован. В столице 50 тысяч "вторых" квартир. И сегодня человек, который хочет приобрести дополнительную недвижимость, должен покрывать и расходы на застройку инженерно-транспортного сектора. В этом случае реальная стоимость квадратного метра составит не менее 2 тыс. долларов в эквиваленте. Речь не идет о нуждающихся в улучшении жилищных условий, обозначенных существующими законами.

КОМПЕТЕНТНО

Дмитрий КУХАРЕВИЧ,
директор Центра оценки и недвижимости "Эксперт":

Если это желание будет реализовано на практике, оно просто убьет рынок

Неужели жилье в белорусской столице такое дорогое? Ведь ни для кого не секрет: для того чтобы жить в квартирах, которые строители сдают якобы "под ключ", жильцам нужно вложить еще едва ли не половину того, что они уже потратили. Прокомментировать заявление председателя Мингорисполкома мы попросили независимого эксперта Дмитрия Кухаревича.

— Сегодня застройщики продают в столице новые квартиры по цене 1000, 1100 долларов в эквиваленте за квадратный метр, — говорит эксперт. — Во всяком случае заключают договоры долевого строительства. И в эту сумму прекрасно вмещаются и себестоимость коробки, и отводы, сносы и т.д. Возможно, фирмы работают не с такой прибылью, как раньше, но все равно никто в ущерб себе дома не строит. Что имел в виду Николай Ладутько? Возможно, было озвучено желание переложить какие-то расходы в строительстве на более состоятельных граждан. Может быть, прощупывалась почва ввести какие-то надбавки к цене квадратного метра. Но если это желание будет реализовано на практике, оно просто убьет рынок. Не исключаю, что заявление Ладутько было всего лишь попыткой разогреть рынок, сказано для того, чтобы подвигнуть людей активнее покупать квартиры.


— А что, сегодня квартиры в Минске плохо продаются?

— Сейчас более-менее рынок работает, новое жилье продается. Не так, конечно, как до кризиса, когда, к слову, в некоторых новостройках Минска цена квадратного метра достигала 2 тысяч долларов, но оживление, положительная динамика есть. Возможно, отчасти это связано с небольшим снижением процентных ставок: по мере ее снижения падает привлекательность рублевых депозитов и появляется больше стимулов вкладывать деньги в недвижимость. По отзывам риелторов, сейчас достаточно активно квартиры в Минске покупают россияне.

— На ваш взгляд, сейчас благоприятное время для покупки жилья? Цена квадратного метра может повыситься в ближайшее время?

— На мой взгляд, даже несмотря на заявление Николая Ладутько, в ближайшее время нет. 2 тысячи долларов за квадратный метр жилья в Минске — это не быстрая перспектива.

Мария ЭЙСМОНТ.



ЧУЛІ?

«Энвіла» ліквідуецца

Прыватны жаночы інстытут паспеў адпрацаваць 18 гадоў, але з гэтага года спыняе набор абітурыентак і будзе рэарганізаваны. У інстытуце кажуць, што іх установа нерэнтабельная.

Рашэння Мінадукацыі наконт ліквідацыі інстытута пакуль няма. Аднак, як паведамляе "Еўрарадыё", у "Энвіле" кажуць, што іх студэнткі цэлымі факультэтамі будуць пераводзіцца ў іншыя ВНУ. Папярэдняя дамоўленасць ужо ёсць. Так, у Беларускім дзяржаўным універсітэце будуць вучыцца эканамісты, у Педуніверсітэце — псіхолагі.

ТЫМ ЧАСАМ

Беларусам прапануюць бясплатнае навучанне ў расійскіх ВНУ

Грамадзяне Беларусі атрымалі магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю за кошт сродкаў расійскага бюджэту.

Прыём дакументаў для абітурыентаў, якія паступаюць на навучанне па праграмах "бакалаўрыят" і "магістратура", будзе праводзіцца да 20 мая, для паступаючых у аспірантуру і па праграмах павышэння кваліфікацыі — да 25 чэрвеня.

Як адзначае belta.by, асноўнымі крытэрыямі конкурснага адбору кандыдатаў з'яўляецца наяўнасць дакумента пра базавую адукацыю з сярэднім балам, не ніжэйшым за "восем", а таксама адпаведнасць базавай падрыхтоўкі з заяўленым для навучання накірункам ці спецыяльнасцю.

АФІЦЫЙНА

Выбух гранаты ў Кобрыне прызнаны тэрарыстычным актам

Распачата крымінальная справа па артыкуле "Тэрарызм".

Нагадаем, вечарам 25 красавіка ў Кобрыне адбыўся выбух гранаты, загінулі два чалавекі — 55-гадовы мужчына і яго 33-гадовы сын, які нядаўна вярнуўся з Паўночнага Каўказа. Цяпер правяраюцца розныя версіі, а сярод іншых і датычнасць загінуўшых да арганізацыі нелегальнай рэалізацыі "сродкаў паражэння", паведамляе БЕЛТА.

ВОСТРАЎ ЗДАРОЎЯ

Тут ветрыкам азёрным лечаць

І зязюлі даўгалецце прарочаць

...І вось на востраў прыходзіць вясна. Спачатку зацвітаюць пралескі, затым распускаюцца цёмна-сінія бутоны фіялак. А пазней успыхваюць усімі фарбамі вясёлкі іншыя кветкі. Шумяць на ўзгорку сосны. А ніжэй па берагах, што спускаюцца да возера, — лясок змешаны. І тут кіпяць белай квеценню дзікія грушы, яблыні, чаромха. Крыху пазней распускаюцца гронкі бэзу. Пяюць птушкі. Дзесьці кукуе зязюля. Прарочыць доўгія гады.

У самы разгар вясны былым салдатам Вялікай Айчыннай вайны, што жывуць у Лепелі, тэлефануюць з медыцынскага цэнтра "ЛОДЭ".

— Запрашаем вас, дарагія ветэраны, адпачыць на востраве...

А востраў гэты — побач, на мясцовым Лепельскім возеры. Медыцынскі цэнтр "ЛОДЭ", які шырока вядомы не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі, некалькі гадоў таму адкрыў тут пансіянат. Пабудавалі прыгожыя і камфортныя драўляныя домікі з усімі зручнасцямі. Ёсць пабудовы і цагляныя. Аматараў "лёгкай пары" чакае добрая лазня. Калі ўбачыце на возеры цеплаход — ён, вядома ж, пансіянацкі.

Ну а для тых, хто ахвочы парыбачыць, — таксама раздолле. Гэта ж востраў: закідвай вуду з любога берага — навокал возера. Возера чыстае. Пра гэта сведчыць самая надзейная і добрадасведчаная "санітарная служба" — чорныя ракі з вялізнымі кляшнямі. Раз яны тут жывуць і добра сябе адчуваюць — значыць, усё ў парадку.

— Нас зноў кліча добры зямляк, — абзвоньваюць адзін аднаго ветэраны. — Паедзем на востраў адкрываць сезон.

Добры зямляк — гэта Уладзімір Гарбачоў, кандыдат медыцынскіх навук, вядомы ў Беларусі. Дзякуючы яму і з'явіўся медыцынскі цэнтр "ЛОДЭ", які мае філіялы ў кожным абласным цэнтры краіны. Вопытныя медыкі аказваюць паслугі тысячам людзей.

У мясцовым музеі ёсць фота бабулі У.У.Гарбачова — Ванды Лодэ. Ёсць тут кнігі яго бацькі Уладзіміра Васільевіча Гарбачова — доктара медыцынскіх навук,







прафесара, вядомага ў Беларусі кардыёлага.

Бацька і сын — людзі гуманнейшай прафесіі.

Маладзейшы Гарбачоў ужо некалькі гадоў, з таго часу, як адкрыўся на востраве Лепельскага возера пансіянат, вясной, у самую прыгожую пару года, кліча ветэранаў на некалькі дзён адпачыць. Зразумела, што зусім бясплатна.

Нават зязюлі, напэўна, пастаўлены на службу добраму здароўю. Яны кукуюць доўга-доўга — прарочаць адпачываючым шмат гадоў жыцця.

"Тут ветрыкам азёрным лечаць", — сказала некалі пра Лепельшчыну ў адным са сваіх вершаў паэтэса Еўдакія Лось. Шчырыя радкі верша ўзгадвае кожнаму, хто прыязджае на востраў, загадчыца пансіяната Надзея Іванаўна Марозава.

Анатоль АРЦЁМАЎ.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ

Крывадушша святароў праваслаўнай царквы

Шаноўная рэдакцыя!

Царкоўныя святы і даты ў апошнія гады ўсё больш і больш адзначаюцца ў народзе. І нават шырэй і змястоўней, чым дзяржаўныя, і вернікамі, і атэістамі. Людзі шукаюць адказы на жыццёвыя пытанні, жадаюць прадбачыць сваё будучае, прагнуць ясных тлумачэнняў аб тым, што адбываецца ў нашай краіне.

Таму і ідуць у царкву, бо ў дзяржаўных установах, напрыклад, па радыё, тэлебачанні, у афіцыйных газетах, на дыскатэках, тусоўках, у клубах і г.д. аргументаваных адказаў ніхто не дае, наадварот, усё заблытваецца яшчэ больш.

Жыццёвыя абставіны і мяне прывялі ў царкву. Уражанняў багата, але ж я распавяду толькі аб адным. У Свята-Міхайлаўскай царкве ў Гомелі вісіць плакат: "Сохраняющий свой язык, сохраняет и душу свою от многих грехов и падений". Дужа правільна, станоўча і прыгожа. Але ж на расійскай мове ў беларускай царкве! І ніводнай літары на роднай, беларускай мове! І ўсё набажэнства вядзецца толькі на расійскай, старaславянскай мовах. А дзеля чаго Бог даў нам, беларусам, сваю адметную і такую прыгожую мову? І ці не святатацтва гэта — адступаць ад Божых наказаў?

Можа, таму і не чуе Бог нашых малітваў, што мы адрынулі яго дар? Мабыць, таму і пакутуе наша Беларусь. А колькі магчымасцяў у царквы для выхавання сапраўдных Божых і чалавечых якасцяў ва ўсіх нас!

Хацелася б, каб хто-небудзь са святароў праваслаўнай царквы (каталікі вядуць набажэнства на беларускай) адказаў на мае пытанні.

Міхаіл Міхайлавіч БУЙНІЧ, пенсіянер.

Гомель.

ЧЕЛОВЕК — ЧЕЛОВЕКУ

Открытое письмо Марине Циблиенко

Я с удивлением узнал, что Вы в стиле сталинского времени решили расправиться с Виктором Ивашкевичем.

Во-первых, Вы от его высказываний экономически не пострадали и не вправе требовать от него 500 тысяч рублей (30 сребренников).

Во-вторых, почему Вы не подали в суд на конкретных виновников, находящихся в высших эшелонах власти, когда Вам в результате девальвации резко снизили зарплату, когда доходы людей упали наполовину? Вы не подали в суд ни за фальсификации на парламентских и президентских выборах, ни после того, как пропали Виктор Гончар, Юрий Захаренко, Дмитрий Завадский, Анатолий Красовский и т.д.

В-третьих, Вы не пострадали морально, так как Виктор Ивашкевич Вас не оскорбил ни лично, ни за Вашей спиной, ни какими-либо намеками.

Преступления со стороны Виктора Ивашкевича я не вижу, каждый имеет право высказать свою точку зрения на те или иные события в стране, в мире.

А вот Вы нарушаете закон. Вы пытаетесь при помощи суда запретить Виктору Ивашкевичу высказывать свое мнение, свою точку зрения. Это на Вас нужно подавать в суд, Вас нужно судить. Вы сами (или по указанию власти) захотели прославиться на всю страну. Разочарую Вас: время уже не то и народ не тот. Многие уже не верят власти, которая допустила серьезные экономические промахи, не раз нарушала закон о выборах, расправлялась с инакомыслящими.

Не сомневаюсь: найдутся такие, кто Вас поддержит. Но пройдет суд (если пройдет), и подавляющее большинство людей будут показывать пальцем в Вашу сторону: "Вон пошла та, которая помогает властям бить оппозицию..." Потом Вас все бесследно забудут, как забыли многих, кого власть использовала и выбросила. Забудут, как уже забыли того кандидата в президенты, который в случае своей победы обещал поставить А.Лукашенко премьер-министром.

Не ставьте себя, Марина, в один ряд с убийцами царя Николая II, с людьми, которые расстреливали оппозицию и невиновных в 1937 году. Оппозиция тоже может подать на Вас в суд, попросить Евросоюз сделать Вас невыездной в страны ЕС, пожаловаться будущему президенту Беларуси на Вас, что Вы очень активно в 2012 году помогали власти расправляться с оппозицией.

Ваши дети, внуки через много лет спросят Вас: "Бабушка (мама), как ты боролась с тем диктаторским режимом, который был?" Что Вы ответите? Я помогала власти бить оппозицию? Вам будет стыдно.

Заберите заявление из суда на Виктора Ивашкевича. Пока не поздно. И не делайте никогда таких ошибок в жизни.

Олег МОРХАТ.

г.Шарковщина.

З ПІСЬМА

Хто наш Гандзі?

Надзённейшае сёння пытанне — стварэнне грамадзянскай супольнасці. Без людской салідарнасці чаго-небудзь прыкметнага дасягнуць немагчыма. На жаль, пакуль у нас няма грамадзянскай супольнасці. Чакаць, што яна сама ўзнікае, утопія. Таму ўсё часцей і часцей задаюся пытаннем:

— Хто наш Гандзі?

М.ЦІТОЎ.

Орша.

РЭХА

Малайчына, Лявонцій!

Гэта мой водгук на адкрытае пісьмо дэпутата Вярхоўнага Савета 12-га склікання Лявонція Зданевіча Аляксандру Лукашэнку ("Народная Воля", №№51—52 ад 30 сакавіка 2012 г.) "Надругательство над беззащитным человеком — аморально".

Лявонцій смела і адкрыта, ні за каго не хаваючыся, патрабаваў адпусціць палітвязняў — патрыётаў Беларусі з-за кратаў. І хаця нельга не радавацца, што А.Саннікаў і Д.Бандарэнка ўжо вызвалены, у няволі застаецца яшчэ нямала асуджаных, лічу, ні за што: М.Статкевіч, С.Каваленка, З.Дашкевіч, М.Аўтуховіч і іншыя. Таму мае сябры гатовы падпісацца пад кожным радком згаданага пісьма.

У мяне адразу ўсплыло ў памяці, як на экране: былы прыгарад Брэста — Валынка, галасы Лявонція і яго сяброў, яго хата, яго школа цераз дарогу. Адзін з яго дружбакоў Юра Зданевіч, мой выхаванец, быў калісьці прызёрам першынства СССР у боксе. Ды колькі вас, Зданевічаў, харошых хлопцаў, вырасла ў Валынцы. А па ўсёй Беларусі?

Ахоплівае гонар за мужных людзей, якія паўстаюць на абарону лепшых сыноў нашай Радзімы, на абарону гістарычных сімвалаў нашай Беларусі. І хаця побач з імі, высакароднымі і годнымі, ходзяць нейкія пачварныя вампіры, святло і дабро ўсё роўна пераможаць!

В.БАРБОЛІН, ветэран спорту, суддзя нацыянальнай катэгорыі.

Брэст.

Як «пятая калона» дыктатуры прышывае кабыле хвост

